УДК 282

# МІСІЯНЕРСКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ОРДЭНА БАЗЫЛЬЯН НА БАЛКАНАХ У І ПАЛОВЕ XVII ст.

**Казуля Сяргей Віктаравіч**
Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі (г. Гродна, Беларусь)

*У артыкуле разглядаюцца спробы місіянерскай дзейнасці ордэна базыльян сярод сербскага праваслаўнага насельніцтва у І палове XVII стагоддзя.*

Эпоха Контррэфармацыі прынесла пашырэнне ўплыву Каталіцкай Царквы ва ўсім свеце. Ва Усходняй Еўропе прадметам асаблівай увагі Апостальскай Сталіцы былі праваслаўныя, якія засялялі абшары Рэчы Паспалітай, уладанні Габсбургаў, Венгрыю, Трансільванію, Асманскую імперыю, Маскоўскую дзяржаву. Ключавую ролю ў распаўсюджванні каталіцтва ў гэтым рэгіёне адводзілася ўніяцкаму манаству Рэчы Паспалітай, якое ў 1617 г. аб'ядналася ў ордэн базыльян. І гэта зразумела: уніятам, якія прытрымліваюя ўсходняга абраду, было лягчэй працаваць сярод праваслаўных, чым католікам – лацціннікам. На думку стваральніка базыльянскага ордэна Іосіфа Вельяміна Руцкага, уніяцкія "манахі будуць успрымацца (праваслаўнымі) як свае, таму ім лягчэй будзе "навучаць народ, вяртаць яго да паслухмянасці Святой Рымскай Царкве" [8, с. 24].

У мемарандуме "Масковія" (1624) ён пісаў аб мажлівасці місіянерскай дзейнасці ўніяцкіх манахаў не толькі на Русі (беларуска – украінскія землі), але таксама і ў Масковіі, і сярод іншых шматлікіх народаў гэтага абраду..., а менавіта: ...ў Валахіі, Малдавіі, Венгрыі, Сербіі, Балгарыі" [6, с. 28].

Гэты амбіцыёзны план не быў здзейснены. Спробы місіянерскай працы былі зроблены толькі на Балканах. Ва ўладаннях аўстрыйскіх Габсбургаў жыло шмат праваслаўных, сярод якіх былі сербскія ўцекачы з Асманскай імперыі (г. зв. ускокі). Частка іх пасялілася ў горнай мясцовасці Жумбэрак (на мяжы Харватыяі і Славеніі). Заграбскі рымска – каталіцкі епіскап Пётра Дамітрыевіч перадаў сербам спусташоны кляштар у вёсцы Марча. Пазней ён стаў цэнтрам новаўтворанай Марчанскай епархіі. У 1611 г. Сымон, епіскап марчанскі, прыняў унію [9, с. 102; 11, с. 128]. Кантакты сербскіх уніятаў з Рымам былі эпізадычнымі, таму Кангрэгацыя Прапаганды Веры ў 1628 г. запатрабавала ад папскага нунцыя ў Вене К. Карафа падрабязаную інфармацыю. Той вырашаў паслаць у Жумбэрак студэнта Венскага папскага калегіума Мяфодзія Цярлецкага [9, с. 102].

Род Цярлецкіх паходзіў з Бельзскага ваяводства. Сам Мяфодзій ў юнацтве выконваў абавязкі пюара пры падскарбіі ВКЛ Мікалае Трызне [3, с. 446]. На пачатку 1620-х ён прыняў манаства ў ордэне базыльян; у 1626–1630 гг. вывучаў багаслоўе ў Венскім калегіуме [7, с. 160, № 2].

У 1628–1629 гг. Мяфодзій Цярлецкі наведаў Марчу і пазнаёміўся з сітуацыяй [9, с. 102]. Напрыканцы свайго побыту ён склаў план пераўтварэнняў у царкоўным жыцці епархіі. Галоўная роля ў ім адводзілася базыльянам з Рэчы Паспалітай. Яны, на думку аўтара, павінны пасяліцца ў Марчы, заснаваць манастыр, а затым і семінарыю для навучання сербскіх манахаў і святароў [8, с. 257, 329–333]. Сам М. Цярлецкі напрыканцы 1629 г. мусіў пакінуць Харватыю, паколькі атрымаў прызначэнне на пасаду холмскага епіскапа [9, с. 103].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Прыкладна ў гэты ж час з Рэчы Паспалітай на Балканы прыязджае базыльянін Паўлін Дэмбскі (каля 1615–1656). У сярэдзіне 40-х гг. XVII ст. Кангрэгацыя Прапаганды Веры прызначыла яго "апостальскім місіянерам у Баўгарыі, Сербіі, Чарнагорыі", якія на той час знаходзілюя пад уладай Асманскай імперыі [2, с. 123]. П. Дэмбскі быў вымушаны утойваць сапраўдную мэту сваей міюіі; шмат падарожнічаў пераапрануты гандляром або селянінам [2, с.123]. У гарадах Печ (іпэк, Косава) І Катуро ён адчыніў граматычныя школы для манахаў і шляхты з выкладаннем лаціны [2, с. 123; 10, с. 150; 4]. Гэта дазволіла завязаць цесныя адносіны з вышэйшым сербскім праваслаўным духавенствам. У 1652 г. Паўлін Дэмбскі разам з Франам Стаіміравічам, каталіцкім епіюкапам Прызрэна, сустрэўся з Печскім патрыярхам Гаўрыілам Раічам [5, с. 233]. На той час Сербская Праваслаўная Царква знаходзілася ў цяжкім становішчы з-за праследванняў турак. Таму Г. Раіч звярнуўся праз П. Дэмбскага да папы з просьбай аб дапамозе. Абмяркоўвалася І пытанне заключэння царкоўнай уніі, але канчатковае пагадненнне па гэтаму пытанню так І не было дасягнута [5, с. 233].

У рукапісным зборніку мітрапаліта Л. Кішкі (пач. XVIII ст.) І пасланнях П. Дэмбскага ў Кангрэгацыю Прапаганды Веры ёсць інфармацыя аб яго ўдзеле ў падрыхтоўцы царкоўных сабораў 1648 І 1654 гг. у Морачскім манастыры (цэнтральная Чарнагорыя) [2, с. 123; 10, с. 150]. Абодва саборы быццам бы выказалі адданасць сербскага духавенства папе І дэлегавалі ў Рым сваіх пасланнікаў. Сербскія гісторыкі Ё. Радоніч, Н. Мілаш, Д. Сліпчэвіч, аспрэчваюць аўтэнтычнасць саборных актаў і лічаць іх сфальсіфікаванымі самім П. Дэмбскім. [4]. Але нават калі б вышэйзгаданыя пастановы былі сапраўды прыняты, практычных вынікаў яны не мелі. Сербская царква так І не прыняла царкоўную ўнію з Апостальскай Сталіцай.

Аналіз місіянерскай дзейнасці базыльян па-за межамі Рэчы Паспалітай прыводзіць нас да наступных высноваў. Паміж грандыёзнымі планамі мітрапаліта І. Руцкага, Кангрэгацыі Прапаганды Веры І наяўнымі вынікамі юнавала відавочнае разыходжанне. Да сярэдзіны XVII ст. ордэн здолеў накіраваць толькі двух місіянераў на Балканы, аб душпастырскай дзейнасці ў іншых рэгіёнах нічога невядома. Прычыны гэтага трэба шукаць не толькі ў насцярожаным стаўленні праваслаўных да уніі або неспрыяльнай палітыцы ўладаў Маскоўскай дзяржавы і Асманскай імперыі. Становішча уніяцкай царквы ў самой Рэчы Паспалітай на працягу разглядаемага перыяду заставалася досыць хіоткім. Па падліках М. Ваврыка ў 1636 г. ў краіне было 36 базыльянскіх манастыроў з прыблізна 160 манахамі [1, с. 9]. Гэта азначае, што на кожны кляштар у сярэднім прыпадала 4–5 чарняцоў. Такой колькасці было відавочна недастаткова для падтрымання гаспадаркі і духоўнага жыцця ў належным стане У гэтых варунках больш актуальнай была праблема выжывання ордэна ў самой Рэчы Паспалітай, чым місіянерскай дзейнасці сярод праваслаўных суседніх краін.

## Літаратура

1. Ваврик М. Нарис розвитку і стану Василіянського Чина XVII–XX стст. Топографічно-статистична розвідка. – Рим: Видавництво ОО Василіян, 1979. – 219 с.

2. Житєписи Василіян // Записки Чина Св.Василія Великого. – Жовква, 1924. – Т. 1. – С. 105–130.

3. Петрушевич А. К. Сводная галицко-русская летопись. – Львов, 1874. – 329 с.

4. Слиjепчевић Ђ. Борба против унијаћења. // Светославье [Электронны рэсурс] – 15 феб. 2012 – Рэжым доступу: https://svetosavlje.org/borba-protiv-unijacenja. – Дата доступу: 10.03.2022.

5. Турилов А. А., мон. Игнатий (Шестаков) Гавриил I Раич // Православная энциклопедия. – Т. X. – Москва, 2005. – С. 232–233.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

6. Шмурло. Ф.. Римская курия на русском православном Востоке в 1609–1654 годах. – Прага: Орбис, 1928. – 354 с.
7. Blażejovskyj D. Byzantine Kyivan Rite students in pontificall colieges and in seminaries, universities and institutes of Central and Western Europe (1576–1983) – Romae: PP. Basiliani, 1984. – 366 p.
8. Epistolae Josepbi Velamini Rutskyj, Metropolitae Kiovensls Catholicae (1613–1637) – Romae: PP. Basiliani, 1956. – 410 p.
9. Senyk S. Križanić and Ukraine // Papers and Proceedings of the Department of HIstorical Research of the Institute of Historical and Social Research of Croation Academy of Sciences and Arts. – Vol 14. – 1986. – P. 101–112.
10. Skruteń I. Dębskl (Dembski) Paulin // Polski Słownik Biograficzny. – T. 5. – Kraków, 1936. – 1946. – S. 150.
11. Ks Suttner E. Unie Kośćołów Wschodnich z Kościołem Rżymskiem w wlekach XVI i XVII // Unia Brżeska z perspectywy czeterech stulecl. – Lubiin, 1998. – S. 123–141.
Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова